АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ, ТАЦЦЯНА КАЗАК

# Лісты з горада, якога няма

*Калі вывучаць гісторыю Заходняй Беларусі міжваенных гадоў і канкрэтнага тагачаснага Гродна, то рабіць гэта трэба не з дапамогай афіцыйнай статыстыкі і камуністычных лістовак, а найперш чытаючы якасную аўтарскую публіцыстыку. Прафесійныя гісторыкі часта ганяць яе за празмерны суб'ектывізм і заангажаванасць аўтараў, але тое самае, бадай што, можна сказаць пра любы твор чалавечага розуму, бо свядома ці несвядома можа хлусіць і статыстыка, і складальнік самай што ні на ёсць афіцыйнай справаздачы. Аўтар жа публіцыстычнага артыкула, калі стараецца*

**Андрэй Вашкевіч** — гісторык, краязнаўца, сталы аўтар «ARCHE». Жыве і працуе ў Гродне. Даследуе гісторыю беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Польшчы, гісторыю і культуру Гродна. Апошняя кніга — «На Гродзенскім друку: вандроўка па фабрыках і прадпрыемствах старога Гродна» (Гродна, 2012). Апошняя публікацыя ў «ARCHE» — «З гісторыі аднаго палітычнага праекта, або аўтаномія для Заходняй Беларусі» (7—8/2014, сумесна з Аляксандрам Быстрыкам).

**Таццяна Казак** — гісторык, краязнаўца. Скончыла гістфак Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістратуру Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Дактарантка Інстытута славістыкі Польскай акадэміі навук. Даследуе гісторыю перыядычнага друку і музеяў міжваеннай Заходняй Беларусі. Мае шэраг публікацый па гісторыі фатаграфіі на Гродзеншчыне, пра дзейнасць Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея ў міжваенны час і інш.

*быць сумленным з самім сабою і з'яўляецца асобай назіральнай, пакідае на пажаўцелых старонках газет унікальныя сведчанні часу, якія для нас, людзей з іншай эпохі, ёсць быццам акном у іншы свет.*

*У міжваенным Гродне з 1921 да 1939 гг. выходзіла больш за сем дзясяткаў польскіх, яўрэйскіх, беларускіх і рускіх газет. Знайсці ў іх можна было амаль усё — пачынаючы ад коштаў на дровы і скончваючы паведамленнямі пра з'яўленне вампіраў (усё амаль як цяпер), але грунтоўнай аналітыкі было няшмат. Магчыма, прычынай таму быў невысокі ўзровень мясцовай журналістыкі, а магчыма (і нават хутчэй за ўсё) — вельмі ж складана было пісаць пра самыя балючыя і важныя рэчы ў такім невялікім горадзе, дзе ўсе звязаныя адзін з адным і збольшага іграюць даўно завучаныя ролі.*

*Юзаф Мацкевіч вылучаўся сярод польскіх журналістаў адсутнасцю для яго забароненых тэмаў. Яго вострыя рэпартажы ў віленскай газеце «Słowo», выдаванай ягоным братам Станіславам Мацкевічам-Цатам, выклікалі амаль аднолькавае непрыняцце і ў улады, і ў апазіцыі, аж да камуністаў уключна. Чаму так адбывалася? Мабыць, таму, што ён не дзяліў людзей на добрых і дрэнных, паказваў грамадскае жыццё як клубок супярэчнасцяў, дзе кожны робіць свой уклад у тое, каб стасункі паміж людзьмі станавіліся яшчэ больш вострымі, невыноснымі, нават ідыятычнымі. Гэта добра відаць з ягонай выдадзенай у 1938 г. кнігі «Бунт ройстаў (тваняў)», дзе, здавалася б, ціхае жыццё мястэчак і вёсак Заходняй Беларусі па-прароцку было паказана як зацішша перад навальніцай... навальніцай узаемнага вынішчэння.*

*Тым і каштоўная для нас справаздача аўтара з чатырох дзён побыту ў Гродне ў студзені 1936 г. Знаўцы гісторыі Гродна будуць ведаць пра гісторыю горада больш, чым Юзаф Мацкевіч. Іх не здзівіць наяўнасць у Гродне вуліцы Ліёнскай, або яны паправяць аўтара, ведаючы, што апошні сейм Рэчы Паспалітай адбыўся не ў Старым, а ў Новым замку. Аднак перадаць атмасферу гродзенскіх вуліц, адчуць дух горада без рэляцый накшталт той, якая прапануецца чытачу ніжэй, было б вельмі складана.*

## ЮЗАФ МАЦКЕВІЧ. ЧАТЫРЫ ДНІ Ў ГРОДНЕ
## ПРАГУЛКА НА ЗНЕШНЯЙ ПАВЕРХНІ ГОРАДА

Адзін з маіх варшаўскіх знаёмых сказаў пра Гродна наступнае: прывабны горад, асабліва калі яго знесці і пабудаваць наноў. Можна ў адказ на такія выказванні схапіцца за свае валасы ці за валасы знаёмага і трохі іх пацягаць, але можна майго сябра і зразумець. Для мяне Гродна вельмі прыгожы, бо я яго ведаю. Аднак для кагосьці, хто не ведае яго, можа падацца, што ён такі ці сякі, або сапраўды